Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 12 (136) Серада, 11 красавіка 1990 года

## НА ШЛЯХУ ДА ЯДНАННЯ І МІЛАСЭРНАСЦІ

На нарадзе прадстаўнікоў рэспубліканскіх, краявых і абласных арганізацый воінаў-«афганцаў», якая адбылася ў Маскве 24—25 сакавіка, было вырашана стварыць Усесаюзную арганізацыю ветэранаў Афганістана. З гэтай мэтай плануецца правесці ў верасні Усесаюзную ўстаноўчую канферэнцыю былых воінаў-«афганцаў».

На нарадзе створаны арганізацыйны камітэт; прынята рашэнне аб правядзенні да пачатку Усесаюзнай канферэнцыі паўсямесна рэспубліканскіх, краявых і абласных канферэнцый.

Прыняты таксама зварот да ўсіх воінаў-«афганцаў». Вось яго тэкст.

Мы, удзельнікі Усесаюзнай нарады воінаў, якія ўдзельнічалі ў баях у Афганістане, звяртаемся да ўсіх ветэранаў Афганістану — да салдатаў і сяржантаў, да афіцэраў і генералаў — з заклікам аб'яднаць свае рады ў імя міласэрнасці, у імя міру, у імя дэмакратыі ў нашай краіне.

Афганістан — незагойная рана, агульны боль. Наш святы абавязак перад светлай памяццю загінуўшых баявых сяброў — акружыць іх сем'і, сем'і інвалідаў маральнай падтрымкай і цяплом нашых сэрцаў, аказваць ім неабходную матэрыяльную падтрымку. Ужо гэты абавязак памяці перад паўшымі і абавязак дапамогі тым, хто церпіць нястачы, кліча нас аб'яднаць намаганні на гэтым святым поле дзейнасці міласэрнасці.

Мы, ветэраны Афганістана, сведкі і ўдзельнікі той братазабойніцкай вайны, якую ўжо больш 11 гадоў вядуць між сабой людзі роднай краіны, павінны выступіць адзінай сілай супраць праяўлення любых нацыяналістычных амбіцый і міжнацыянальных канфліктаў. Мы не можам дазволіць на сваёй роднай зямлі нічым не апраўданых ахвяр, новых слёз удоў і маці, новых дзяцей-сірот. Вось чаму мы павінны выступаць адзінай сілай, агульным фронтам.

Наша пазіцыя, заснаваная на аналізе грамадска-палітычнага і фінансава-эканамічнага становішча, якое склалася ў краіне і асобных яе рэгіёнах, і на глыбокай перакананасці ў неабходнасці карэннай перабудовы, якую абвясціла партыя ва ўсіх сферах грамадскага і эканамічнага жыцця нашай Радзімы, заключаецца ў актывізацыі непасрэднага ўдзелу былых воінаў-«афганцаў» ва ўсіх пераўтварэннях. Наша канцэпцыя — не быць нахлебнікамі ў дзяржавы, сацыяльным баластам нашага грамадства. А самім, сваёй працай, абапіраючыся толькі на свае ўласныя сілы, энэргію, уменні і веды, рашыць так званую «праблему «афганцаў» і актыўна ўключыцца ў пераадольванне эканамічнага і сацыяльнага крызісу. Дзеля гэтай высакароднай мэты мы заклікаем усіх ветэранаў Афганістана да аб'яднання.

Перад памяццю нашых таварышаў, якія загінулі на зямлі Афганістана, нашых братоў розных нацыянальнасцей, — заклікаем усіх «афганцаў», каму дарагі лёс нашай Айчыны, да яднання.

**В. САРОКІН,**
**старшыня абласнога савета воінаў-інтэрнацыяналістаў.**

## Правафланговыя



**Дзмітрый Аўсейчык і Васіль Салдатаў — студэнты 2 курса 2 групы матэматычнага факультэта, людзі, з якіх бяруць прыклад многія ва універсітэце. Актыўныя ўдзельнікі ўсіх камсамольскіх мерапрыемстваў, выдатнікі вучобы, а Дз. Аўсейчык — член Вучонага савета універсітэта.**

## Ленінскі суботнік ва універсітэце

Узнікнуўшы ў час, калі маладая Савецкая Рэспубліка перажывала адзін са складенейшых перыядаў грамадзянскай вайны, камуністычныя суботнікі з'явіліся новай хваляй працоўнага энтузіязму рабочага класа. У. І. Ленін убачыў у суботніках вышэйшую арганізацыю працы, парасткі новага, камуністычнага грамадства. «Коммунистические субботники именно потому имеют громадное историческое значение, что они показывают нам сознательный и добровольный почин рабочих в развитии производительности труда, в переходе к новой трудовой дисциплине, в творчестве социалистических условий хозяйства и жизни».

З 1969 года па ініцыятыве працоўных праводзяцца Усесаюзныя камуністычныя суботнікі. Яны прысвячаюцца знамянальным датам у гісторыі Савецкай краіны — гадавінам з дня нараджэння У. І. Леніна. Зробленыя сродкі накіроўваюцца на будаўніцтва лячэбных цэнтраў, школ, дзіцячых бальніц і г. д.

2 красавіка было праведзена сумеснае пасяджэнне парткома, рэктарата, прафкомаў і камітэта камсамола Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, на якім была адобрана ініцыятыва працоўных калектываў г. Гродна аб правядзенні 21 красавіка 1990 года камуністычнага суботніка, прысвечанага 120-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Створаны штаб па падрыхтоўцы і правядзенню суботніка, які ўзначаліў старшыня прафкома выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта У. А. Хілюта. У састаў штаба ўвайшлі прарэктар па АГР, кіраўнікі грамадскіх арганізацый ВНУ, старшыні прафбюро факультэтаў, нам. дэканаў па вучэбна-выхаваўчай рабоце.

Штабу рэкамендавана распрацаваць план правядзення суботніка. Партыйным, прафсаюзным, камсамольскім бюро і гаспадарчым кіраўнікам прапанавана разгарнуць арганізацыйную і палітычную работу па распаўсюджванню патрыятычнай ініцыятывы аб правядзенні камуністычнага суботніка і пералічэнні зробленых у гэты дзень сродкаў на рахунак прафсаюзнай арганізацыі для выкарыстання іх у дабрачынных мэтах.

Адміністрацыя універсітэта, партком, прафкомы, камітэт камсамола запрашаюць усіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў прыняць актыўны ўдзел у камуністычным суботніку, які прысвечаны 120-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

### НАМ ПІШУЦЬ

## Развітанне не для нас

Падыходзіць да канца наша вучоба на факультэце правазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Наперадзе апошнія экзамены, а неўзабаве будзем развітвацца з тым, што было дарагім на працягу шасці гадоў — такіх доўгіх, і такіх кароткіх.

Цяпер, праз прызму пройдзенага часу, звяртаемся да таго, што было, і ўжо ніколі не вернецца.

Неяк трохі сумна. Так, напэўна, заўсёды бывае, калі атрымліваеш тое, аб чым марыў. Сумна таму яшчэ, што трэба развітвацца з тымі людзьмі, якія аддалі табе частку свайго сэрца, сваёй душы, сваёй думкі.

З першых дзён вучобы нас ветліва сустрэла цудоўная жанчына, метадыст факультэта правазнаўства Вера Пятроўна Удавічэнка. Сустрэла, і неадступна была разам на працягу шасці гадоў. «Наша універсітэцкая мама», — так ласкава называюць яе студэнты.

А колькі ўдзячнасці мы выказваем сёння нашаму паважанаму Міхаілу Вікенцьевічу Васілючаку! Гэта ж не толькі добры выкладчык, гэта яшчэ і шчырай душы чалавек. Ніколі не забыць нам тыя штогадовыя прамовы, з якімі ён звяртаўся да нас на пачатку кожнай сесіі. А каму прыходзілася падыходзіць да прарэктара з пытаннямі, той заўсёды адчуваў яго бацькоўскі клопат, гатоўнасць дапамагчы.

Мяркую, што выкажу думку амаль усіх нашых студэнтаў, калі звярнуся з добрым словам да выкладчыцы грамадзянскага права Галіны Тухтараўны Осіпавай. Мы памятаем лекцыі, калі з захапленнем слухалі яе амаль чатыры гадзіны. Маглі б і яшчэ. Настолькі проста, цікава, з тонкім гумарам гучалі яе словы. А як яна звярнулася да нас на чацвёртым курсе: «Паважаныя калегі!». Нават «падраслі» ад такіх слоў.

Нельга не выказаць слоў падзякі і выкладчыку крымінальнага працэсу Міхаілу Аляксандравічу Варабейнікаву.

Гэта былі не проста лекцыі. Тут была перад намі наогул уся навука крымінальнага працэсу. Колькі спрэчак гучала па кожнаму артыкулу крымінальна-працэсуальнага кодэксу! Выкладчык вучыў нас думаць, знаходзіць галоўнае.

Ды і на практычныя заняткі так проста не прыйдзеш. Трэба ў бібліятэцы пакапацца — манаграфію ці які-небудзь юрыдычны часопіс адшукаць, некалькі задачак рашыць, працэсуальныя дакументы напісаць. А хадзілі ж на заняткі ўсе. Быць такога не можа? Можа! Таму што цікава і патрэбна!

Так выкладаў крыміналістыку Георгій Аляксеевіч Зорын. Нетрадыцыйны падыход да выкладання гэтай навукі ў нашым універсітэце. Вось тое новае, што павінна даць добры вынік.

Былі дзелавыя гульні. Што гэта? А вось што. Раптам аудыторыя ўяўляе сабой кабінет следчага. Цішыня, ідзе допрос сведкі падзеі. Следчы, ён жа студэнт Карнацэвіч, знаходзіць псіхалагічны ключык да свайго партнёра (сцэнарый напісаны самімі студэнтамі).

А потым дыялог выкладчыка са студэнтамі. Што было добра, дзе памылкі ў тактыцы допроса?

І так яшчэ і яшчэ — новая пара, новы сцэнарый, новы дыялог...

На пятым курсе — практыка. Тут і спатрэбіліся веды, што атрымалі за гэты час. Хто займаўся штодзённай працай (а ў нас многія студэнты — супрацоўнікі міліцыі), хто на месяц стаў юрыстам на прадпрыемстве, хто — памочнікам раённага пракурора.

Са словамі павагі звяртаемся мы і да нашага дэкана, доктара юрыдычных навук Сцяпана Фёдаравіча Сокала. Гэта пад яго кіраўніцтвам магчыма жыццё на факультэце правазнаўства новых форм выкладання, развіццё юрыдычнай навукі.

Шчырая падзяка выкладчыкам, што дзяліліся з намі сваімі ведамі на працягу шасці гадоў. Ніколі не забудзецца кожная лекцыя, прачытаная Уладзімірам Аляксеевічам Тамсінавым, Мікалаем Уладзіміравічам Сільчанкам, Іванам Міхайлавічам Гарбачовым, Людмілай Міхайлаўнай Серадой, Васілём Цімафеевічам Калмыковым. Дзякуй усім, хто, не шкадуючы часу, вучыў нас быць не проста юрыстамі, а яшчэ і адукаванымі, культурнымі людзьмі.

Добрыя словы хочацца сказаць і аб нашых бібліятэкарах — Крысціне Пятроўне Жураўлёвай і Галіне Бырдзе, якія шмат дапамагалі нам.

З такімі пачуццямі падыходзім мы да фінішу.

Прыміце ад нас, дарагія нашы выкладчыкі, нізкі паклон за вашу працу, за добрыя адносіны да нас.

Наперадзе ў нас з вамі шмат сумесных спраў па перабудове жыцця, па пераўтварэнню краіны ў прававую дзяржаву.

Вы далі нам усё, што маглі даць — цяпер аддача за намі.

Таму не развітваемся мы з вамі. А гаворым толькі: «Да пабачэння. Да новай сустрэчы».

**Т. ЛУГІНІНА,**
**студэнтка 6-га курса факультэта правазнаўства.**

## КАМЕНЬ СУТЫКНЕННЯ — САМАСТОЙНАЯ РАБОТА

# За і супраць

### Гэты доўгачаканы «свабодны» дзень
### Добрая арганізацыя — справа нялёгкая
### У фізікаў свой багаж
### Не задаволены — прапануй лепшае

ВЫШЭЙШАЯ школа перажывае зараз складаны і адказны перыяд: ідзе перабудова сістэмы навучання. Рэчаіснасць ставіць свае патрабаванні: падрыхтаваць у ВНУ людзей, здольных самастойна і творча вырашаць задачы сучаснасці, навучыць працаваць з новымі тэхналогіямі, уменню разабрацца ў вялізным патоку навуковай інфармацыі. Як бачым, пытанне ў якаснай перабудове, і асновы павінны закладацца ў студэнцкім асяроддзі.

Вось ужо некалькі гадоў існуе ў нашым універсітэце практыка самастойнай работы студэнтаў. Мне давялося вучыцца на першых



курсах, калі яна з'явілася ў нашым жыцці. Адразу невядомы быў тэрмін. Што прынясе ён студэнтам і выкладчыкам добрага? Рэзка былі скарочаны аудыторныя заняткі. На 1—3 курсах студэнты займаліся 28—30 гадзін у тыдзень, на 4-5—24-26 гадзін. Дні самастойнай работы былі ўведзены на большасці факультэтаў. Але ці ўсё гэта было добра?

Былі праведзены сацыялагічныя даследаванні сярод студэнтаў па ацэнцы самастойнай работы. І што ж яны паказалі нам? Больш паловы студэнтаў не задаволены ні яе ўмовамі, ні зместам. У чым жа тут справа?

ПАМЯТАЕЦЦА сход студэнтаў і выкладчыкаў на 3 курсе філалагічнага факультэта. Вось якія думкі, меркаванні, разважанні гучалі на ім.

Лекцыі дапамагалі студэнтам арыентавацца ў складаным матэрыяле, выбіраць самае неабходнае. А без выкладчыкаў цяжка рыхтавацца самастойна. Многія са студэнтаў замест таго, каб займацца ў чытальнай зале, працаваць так, як трэба, выкарыстоўвалі гэты час зусім у іншым плане. Вядома, гэта не магло не сказацца на агульнай паспяховасці ў час сесіі. Па майму разуменню, асновай, падставай для працы, своеасаблівым фундаментам павінны служыць звесткі выкладчыка, ужо паглыбленыя і пашыраныя іншымі дапаможнікамі і практычнымі заняткамі. А што нам даў «свабодны» дзень, вызвалены быццам бы для навуковай працы? Адразу шматлікая колькасць рэфератаў, калёквіумы, субяседаванні, падрыхтоўка да практычных заняткаў. А дзе час узяць для ўсяго?.. Я выказала сваё ўласнае, магчыма, суб'ектыўнае меркаванне. Са мной, відаць, многія не згадзяцца.

І яшчэ такая думка наконт самастойнай працы А. ШЫМУЛЬ, выпускніцы філалагічнага факультэта 1989 года, зараз — выкладчыцы кафедры польскай філалогіі.

— Неабходнасць напісаць аб самастойнай рабоце студэнтаў падштурхнула мяне да разважанняў аб тым, чым яна павінна быць на самай справе. Увогуле іншы раз здаецца, што ў нас (у нашай ВНУ, як, напэўна, і ва ўсёй нашай сістэме вышэйшай адукацыі) многія паняцці настолькі зменены, што гэта змяніла і саму сутнасць з'явы. Напрыклад, што такое «дысцыпліны спецыялізацыі»? У нашым варыянце — падзел патоку студэнтаў на дзве часткі і наведванне заняткаў (па раскладу) і выкананне, такім чынам, вучэбнага плана. І нават строгае раздзяленне — лінгвісты — у адну аудыторыю, літаратары — у другую. А некалі нават бывалі лекцыі ва універсітэце, на якія збіралася палова Пецербурга, прычым не толькі студэнты, а проста людзі, якія ідуць паслухаць цікавага выкладчыка, павучыцца.

Па майму разуменню, нешта не тое ў нас з «самастойнай работай студэнтаў». Што гэта значыць? Чаму ператвараецца часам проста ў адпрацоўкі?

Спрадвеку было так, што чалавек вучыўся самастойна. Ніхто не мог укласці веды ў галаву, пакуль навучэнец не захоча прыняць іх, засвоіць для сябе. Ён жа робіць гэта самастойна. І кнігі чытае студэнт-філолаг самастойна, артыкулы перапрацоўвае самастойна. Праўда, калі толькі гэта робіцца па-сапраўднаму. Таму, я лічу, патрэбна нешта парэкамендаваць, у чымсьці падказаць, недзе пракансультаваць — дапамагчы студэнту ў яго самастойным засваенні ведаў. Але гэта дапамога патрэбна толькі тым, хто па-сапраўднаму працуе на сябе і на сваё будучае. А як быць з тымі, якія «шэрыя», «сярэднія», — а іх большасць? У любым выпадку не многа знойдзем, калі толькі абвясцім тэмы, якія не паспявалі разгледзець на занятках, ці ўвядзем кантроль (праверку ведаў) па гэтых тэмах у па-за аудыторны час) і ўсё гэта назавём самастойнай работай студэнтаў.

САМАСТОЙНАЯ работа, гэта, як правіла, навука, работа студэнтаў з выкладчыкамі, у першую чаргу. Давайце зазірнем на факультэты і пацікавімся карцінай, якая склалася сёння. Што маюць студэнты гістарычнага факультэта? Галоўная праблема, якая настойліва стукае ў дзверы — утрымаць высокую рэпутацыю гістфака. Усё больш прымяняюцца новыя прагрэсіўныя формы навучання, што значыць павелічэнне часу на самастойную работу, усеагульны пераход да семінараў-дыспутаў, дзе складаюцца перакананні студэнта шляхам апрацоўкі і абагульнення даных першакрыніц, гістарычных школ, пунктаў гледжання. А для гэтага, зразумела, неабходны аб'ектыўныя магчымасці — шырокі доступ да першакрыніц і літаратурных твораў, да статыстычных дакументаў і архіўных даных мінулых гадоў. Ці гатова навуковая бібліятэка ГрДУ прадставіць неабходную літаратуру для заняткаў студэнтаў? Пошук неабходнай літаратуры — гэта праблема і выкладчыкаў.

Не хапае рабочых месц у вучэбных і навуковых лабараторыях, у кабінетах і чытальных залах. Не хапае навуковай, менавіта навуковай літаратуры. Не ва ўсіх выкладчыкаў адпрацавана методыка работы са студэнтамі. Студэнты-гісторыкі 2 курса лічаць, што мэтазгодна пачаць скарачэнне лекцый не з першых курсаў, а дзесьці нават з курса трэцяга, нават з другога семестра.

А як справа складаецца на фізічным факультэце? Паслухаем намесніка дэкана Ю. Р. Бейцюка:

— На фізічным факультэце індывідуальная і самастойная работа здзейсняецца ў трох напрамках:

1) перапрацоўка матэрыялаў лекцый, падрыхтоўка да заняткаў (практычных, лабараторных), кантрольныя работы па тэмах курсаў;

2) самастойнае вывучэнне некаторых тэм, выкананне дамашніх заданняў, напісанне рэфератаў;

3) выкананне дыпломных, курсавых праектаў (работ), удзел у НДР, семінарах навуковага кіраўніка, праца ў клубах «Камп'ютэр», «Фатон».

У мэтах удасканалення форм і метадаў вучэбнай работы на факультэце паслядоўна ўкараняюцца ў вучэбны працэс элементы сучасных тэхналогій навучання, заснаваныя на выкарыстанні развітых сродкаў вылічальнай тэхнікі. У рамках гэтага напрамку на кафедры агульнай фізікі пад кіраўніцтвам дацэнтаў Іванова Я. Я., Гачко Г. А., Маскевіча С. А. распрацоўваецца праграма забеспячэння аўтаматызаваных дыялогавых сістэм, уведзена ў эксплуатацыю аўтаматызаваная сістэма допуска да лабараторных работ фізпрактыкума, паспяхова выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе кантрольна-абучаючая сістэма для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па індывідуальных заданнях.

А ШТО кажуць студэнты? Іх задавальняе расклад заняткаў на факультэце, работа з машынамі ў добраўпарадкаваных аудыторыях. Зазірніце ў пакой № 402, там заўсёды поўна студэнтаў, якія займаюцца без выкладчыкаў пасля заняткаў, у час самастойных лабараторных практыкумаў. Аднаго вельмі б ім хацелася: надрукаваць на ротапрынце, па магчымасці, хоць некаторыя лекцыі выкладчыкаў, каб у любы момант можна было імі карыстацца, той матэрыял, які выпаў па многіх прычынах з лекцыйнага курсу.

Як бачым, у фізікаў усё складаецца нядрэнна. Усё ж відавочна, што самастойная работа — камень сутыкнення розных думак і кропак гледжання. Неаднойчы на Вучоным савеце універсітэта ішло абмеркаванне гэтай праблемы. Як вы мяркуеце, ці з'яўляецца выйсцем са складанага становішча пастаноўка семінара навуковага кіраўніка на 4-ую пару, калі на філалагічным факультэце, напрыклад, без таго не вельмі рана заканчваюцца заняткі, ды і галава студэнцкая не можа вытрымаць такой нагрузкі?

Думаю, што нікому, акрамя саміх студэнтаў, не вырашыць іх жа праблем. У многіх аудыторыях можна пачуць ноткі незадавальнення існуючым, а ці спытаў сябе кожны: «Што я прапанаваў лепшае?»

Пакуль што вялікі і неакрэслены пытальнік вісіць у паветры без пэўнага адказу. Дык давайце ўсе разам, сумеснымі сіламі і магчымасцямі выкладчыкаў і студэнтаў, сваімі рацыянальнымі прапановамі адкажам сур'ёзна на яго, і вырашым, нарэшце, даўно існуючую праблему.

Н. БЕДЗЬ.

## ПРАПАНУЕМ АБМЕРКАВАЦЬ

# ПРАЕКТ ПАЛАЖЭННЯ АБ ЗААХВОЧВАННІ СТРУКТУРНЫХ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ ПА ВЫНІКАХ ПРАВЯДЗЕННЯ ПАДПІСКІ НА ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ І АБ РАЗМЕРКАВАННІ ЛІМІТАВАНЫХ ВЫДАННЯЎ

1. Данае палажэнне распрацавана ў мэтах павышэння культуры, кругагляду супрацоўнікаў універсітэта, заахвочвання лепшых структурных падраздзяленняў і супрацоўнікаў універсітэта, якія прынялі актыўны ўдзел у падпісцы на перыядычныя выданні, а таксама ў мэтах прапаганды кнігі.

2. Для падвядзення вынікаў і аналізу рэзультатаў падпіснай кампаніі ва універсітэце ствараецца камісія ў складзе 5 чалавек: сакратар парткома і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

3. Грамадскія арганізацыі вылучаюць сваіх кандыдатаў у члены камісіі. Састаў камісіі зацвярджаецца парткомам універсітэта тэрмінам на адзін год. Камісія выбірае старшыню і сакратара. Састаў камісіі штогод абнаўляецца на 3/5.

**4. За 10 дзён да заканчэння падпіснай кампаніі адказныя за падпіску на факультэтах, у НДС і апараце упраўлення павінны прадставіць у камісію наступныя даныя:**

а) колькасць афармленых падпісных перыядычных выданняў па кожнаму найменню;

б) колькасць супрацоўнікаў падраздзялення, якія прынялі ўдзел у падпісной кампаніі;

в) кандыдата на лепшага падпісчыка універсітэта (з абмеркаваннем);

г) кандыдата на лепшага прапагандыста і арганізатара падпісной кампаніі.

5. Камісія за 7 дзён да заканчэння падпісной кампаніі разглядае даныя, якія прадстаўлены падраздзяленнямі універсітэта, і падводзіць вынікі.

**6. Лепшае падраздзяленне універсітэта вызначаецца па наступных крытэрыях:**

а) арганізацыя і правядзенне падпісной кампаніі ў даным падраздзяленні (да 10 балаў);

б) кола інтарэсаў супрацоўнікаў падраздзялення (да 5 балаў);

в) адносіны колькасці супрацоўнікаў, якія прынялі ўдзел у падпісной кампаніі, да агульнага ліку супрацоўнікаў данага падраздзялення (колькасць балаў — даныя памнажаюцца на 10);

г) сярэдняя колькасць (Н) падпісных выданняў, якія прыходзяцца на кожнага супрацоўніка падраздзялення (Н балаў).

**7. Лепшы падпісчык універсітэта вызначаецца па наступных крытэрыях:**

а) кола інтарэсаў (да 10 балаў);

б) абсалютная колькасць (Н) афармленых падпісных перыядычных выданняў розных найменняў (Н балаў);

в) агульная сума падпіскі Р (Р/10 балаў).

**8. Лепшы прапагандыст і арганізатар падпісной кампаніі ва універсітэце вызначаецца па наступных крытэрыях:**

а) прапаганда і рэклама зместу падпісных перыядычных выданняў (да 10 балаў);

б) своечасовае і добра арганізаванае правядзенне падпісной кампаніі (да 7 балаў).

9. Лімітаваныя падпісныя выданні, якія універсітэт атрымлівае па фондах Аблкнігагандлю і Саюздруку, паступаюць у распараджэнне камісіі, якая здзяйсняе размеркаванне гэтых выданняў па падраздзяленнях універсітэта.

10. Па выніках падпісной кампаніі лепшае структурнае падраздзяленне універсітэта ўзнагароджваецца 2-ма камплектамі лімітаваных выданняў Саюздруку і 2-ма камплектамі падпісных выданняў з фондаў Аблкнігагандлю, якія паступаюць на працягу наступнага каляндарнага году (па выбару).

11. Лепшы падпісчык і лепшы прапагандыст падпісной кампаніі ўзнагароджваюцца па аднаму камплекту лімітаваных выданняў Саюздруку (па выбару) і па аднаму камплекту падпісных выданняў, якія паступаюць на працягу наступнага каляндарнага году з фондаў Аблкнігагандлю (па выбару).

12. Колькасць лімітаваных падпісных выданняў, якія засталіся, размяркоўваюцца камісіяй па структурных падраздзяленнях універсітэта прапарцыянальна колькасці супрацоўнікаў, якія прынялі ўдзел у падпісной кампаніі.

13. Камісія нясе адказнасць і адказвае за дэмакратычнае і справядлівае размеркаванне лімітаваных выданняў, якія паступаюць ва універсітэт з фондаў Аблкнігагандлю.

14. Падраздзяленні універсітэта, якія не прадставілі ў камісію неабходныя даныя ў тэрміны, вызначаныя палажэннем, адхіляюцца ад удзелу ў конкурсе.

**Праект данага палажэння распрацаваны і абмеркаваны на Савеце клуба аматараў фантастыкі «Сталкер» універсітэта.**

ЗВАРОТНЫ АДРАС — ІНТЭРНАТ

# ЧАМУ ІНТЭРНАТ НЕ СТАЎ РОДНАЙ ХАТАЙ, або ЯК МЫ ДА ТАКОГА ЖЫЦЦЯ ДАКАЦІЛІСЯ



## Ад першай асобы

Цяпер я так думаю: ці патрэбен быў мой візіт у інтэрнат? Размаўляючы са студэнтамі, я бачыла, што мне не вераць. «А што вы зробіце? Што зменіцца пасля нашай сустрэчы?» — гаварылі яны мне.

У інтэрнаце, што на БЛК-3, я ўбачыла шмат жахлівага. Усяго толькі два гады прайшло, як не жыву там. Некалі ў нас было цікава, весела. Пасля заняткаў інтэрнат напаўняўся вясёлым смехам, перазвонам талерак і каструль і г. д. Я не хачу сказаць, што тады ўсё было ідэальна, не. Таксама хапала праблем. Але такога становішча, як цяпер, не было.

Вакол інтэрната белымі плямамі валяюцца кучы паперы, анучы і іншыя непатрэбныя рэчы. Адкуль усё гэта? Вядома, з вакон. Раней такое таксама было, але ж і суботнікі праводзілі, ці проста час ад часу прыбіралі тэрыторыю.

Зараз у інтэрнаце жыве большая палова дзяўчат. Каго, як не іх, павінен турбаваць знешні выгляд інтэрната?

Насупраць нашага інтэрната знаходзіцца медыцынскі інстытут, кожны дзень праходзіць тут нямала людзей. А наш знешні выгляд — гэта ж наш твар!

Ды і самі студэнты змяніліся: ужо не тыя баязлівыя навічкі, якімі былі мы. Але пра гэта ніжэй раскажуць самі студэнты.

## Ці ёсць у інтэрнаце гаспадар?

На гэта пытанне я пачула шмат адказаў. Усе яны гучалі па-рознаму, але змест быў аднолькавым — няма тут гаспадара. Не адчуваюць сябе гаспадарамі і студэнты. Калі заходзіш у пакой, заўважаеш, што гаспадар усё ж-такі ёсць. Мне вельмі спадабаўся 44 пакой. Дзяўчаты з густам падабралі шпалеры, дарэчы, купілі іх за свае грошы і самі паклеілі. Тут вельмі ўтульна. Святлана Мазоль (І курс 7 група філфака), з якой я там сустрэлася, сказала: «У інтэрнаце жыву першы год. Калі першы раз увайшла ў свой пакой, то ўбачыла, што работы тут — непачаты край. Усё, наогул, трэба было рабіць самім: і клеіць, і фарбаваць... Тут у мяне з'явіліся сяброўкі, і мы ўзяліся за работу. А зараз, бачыце, не горш, чым у іншых, а можа нават лепш.

Ці ёсць у інтэрнаце гаспадар? Я лічу, што кожны павінен быць гаспадаром, бо ў такім становішчы, як мы, як наш інтэрнат, адзін чалавек проста нічога не ў сілах зрабіць. Усе толькі гавораць пра розныя недахопы, а самі нічога не робяць. Вельмі многае залежыць усё ж ад студэнтаў, ад іх жадання. Зараз у нас новы камендант. Відаць, чалавек строгі, дык калі ён возьмецца за справу, то можа і будзе парадак».

## Ад першай асобы

Калі я жыла ў інтэрнаце (прашу прабачэння ў чытача за часты зварот да свайго жыцця тут), дык гаварылі не толькі пра парадкі і розныя праблемы, гаварылі яшчэ і пра тое, як студэнты праводзяць свой вольны час, як яны адпачываюць. У гэтым навучальным годзе не было ніводнай дыскатэкі, ды і наогул дысказала не працуе. Раней жа там маглі сустракацца філолагі, фізікі з юрыстамі і гісторыкамі, з матэматыкамі. Да нас нават прыходзілі ў госці студэнты іншых навучальных устаноў. Цяпер гэтага няма.

А яшчэ я не пачула пра галоўнага гаспадара, пра студсавет, які выбіраюць самі студэнты. Ён жа, гэты савет, выслухоўвае ўсе прапановы і рашэнні студэнтаў і праводзіць іх у жыццё. Усё гэта ён павінен рабіць. Але ж дзе ён ёсць такі?

## Студэнцкае самакіраванне

Грабун Таццяна, 5 курс філфака:

— Студсавета няма, значыць, няма і самакіравання. Ведаеце, няма ў студэнтаў жадання нешта рабіць. Нядаўна мы збіраліся на сход, каб выбраць старшыню студэнцкага савета. Прысутнічалі, дарэчы, і члены прафкома студэнтаў. Сабраліся, пахіхікалі, але так нічога і не вырашылі. Нікога не выбралі: не знайшлося таго, хто б захацеў стаць адным воінам у полі. Усе разумеюць, што гэта адказная работа, але адказнасці такой браць на сябе ніхто не хоча. Сілай жа прымушаць нікога не будзеш. Так і пайшлі ні з чым, кожны ў свой пакой, адным словам, вярнуліся да ранейшага жыцця.

Размаўляючы са мной, Таццяна гатавала ежу для сваёй сям'і. Я заўважыла, што гэта кухня — амаль самая чыстая ў інтэрнаце.

— Усё тут мы рабілі сваімі рукамі. Мой муж, таксама студэнт, фарбаваў сцены, трубы. Сам жа чысціць каналізацыю. Але рукі апускаюцца, калі ўбачыш, што яго працы ніхто не цэніць. Дажыліся да таго, што дзяўчаты выліваюць суп не ў спецыяльны бачок для адходаў, а ў ракавіну. Таму потым — бруд, а часам і патоп.

## Вахцёр ці міліцыянер?

Атрымаўшы прапіску ў інтэрнат, чалавек не расквітваецца з традыцыяй адзначаць дні нараджэння і іншыя святы. У інтэрнаце жыве большасць дзяўчат і ператвараць яго ў жаночы манастыр не трэба было б: усе яны павінны выйсці замуж, стварыць сям'ю. Але тут таксама паўстаюць праблемы, на якія трэба глядзець з абодвух бакоў.

Ад студэнтаў я пачула шмат скаргаў на вахцёраў. «Не хачу сказаць, што да мяне ніхто не прыходзіць. Прыходзяць, але не вельмі часта. І я маю права, — гаворыць Валянціна Тумаш, 2 курс філфака) запрасіць да сябе гасцей. Але калі да цябе прыходзіць хлопец, то на вахце цябе так могуць зняважыць перад ім, так паглядзець на цябе, а могуць яшчэ і аблаяць, што сорамна перад чалавекам за наша бескультур'е.

Калі прыходзіць хлопец да дзяўчыны, у яго пытаюць: «Чаго прыйшоў?»; «Хто клікаў?»; а калі выходзіць — «Дзе спаў?»... А калі з вуліцы, бывае, спознішся на некалькі хвілін і дзверы ўжо будуць на замку, то цябе яшчэ могуць і прастытуткай абазваць. Не хачу сказаць, што так заўсёды бывае, але ж і не рэдка. Дык можа лепш паставіць ля дзвярэй міліцыянера, каб ён правяраў пропуск ці пашпарт. Можа, тады з'явіцца культура ў нас, ды і дысцыпліна будзе больш строгая?»

А цяпер паслухаем, што гавораць вахцёры. Іх таксама можна зразумець. Уявіце сабе, у якім стане прыходзяць некаторыя наведвальнікі, іншыя і на нагах не могуць стаяць, але затое нецэнзурныя словы вылятаюць у іх, як з кулямёта.

Вахцёры гавораць, што бываюць такія выпадкі, і не вельмі рэдка, калі ад нашых студэнтаў выходзяць наведвальнікі п'янымі. І ўсё таму, што дні нараджэння, іншыя святы зачастую ператвараюцца ў звычайныя п'янкі. Часта вахцёрам даводзіцца падымацца ў пакоі і выганяць выпівох. Як жа інакш? У адваротным выпадку пайдуць па пакоях, учыняць бойкі.

Так, няма самакіравання. Не наладжана дзяжурства студэнтаў на вахце. А яшчэ студэнты скардзяцца на тое, што іх не клічуць да тэлефона, калі ім звоняць. Многія жывуць далёка, бацькі да іх прыехаць не могуць, а тут і не дазвонішся: не паклічуць. Калі гэта службовы тэлефон, дык ці маюць права вахцёры званіць па цэлай гадзіне па сваіх асабістых справах? Ці маюць права тыя, хто жыве на першым паверсе, карыстацца службовым тэлефонам як асабістым, ці можа для іх закон не пісаны?

Кажуць, праўда цяпер у цане, але нашы студэнты чамусьці баяцца гаварыць пра такое прама ў вочы тым, каму гэта адрасавана.

Ітак, спрэчка мае два пункты гледжання, а каб вырашыць яе, трэба, мабыць, мяняць усю сістэму кіравання ў інтэрнаце.

## Гэта хвалюе ўсіх

Так, забяспечанасць вадой — справа вельмі важная і да канца не вырашаная. Калі мець на ўвазе гарачую, дык трэба сказаць і пра халодную, якая таксама бывае не заўсёды. Як пяецца ў знаёмай песні: «А без вады — і ні туды, і ні сюды». Раней ніколі такога не было, каб стаяла чарга да ўмывальніка. Між тым, тут нават ракавін некалькі знялі, нягледзячы на вялікую колькасць жадаючых мець чысты твар: зноў жа з-за недахопу вады. На чацвёртым паверсе размаўляла з фізікам, пяцікурснікам Уладзімірам Барысевічам: «У нашым умывальніку толькі тры ракавіны, а прыходзяць сюды мыцца нават з іншых паверхаў. Ствараецца чарга, як за каўбасой. Няма ў нас гаспадара. Калі старшынёй студсавета быў Юра Клімовіч, дык было іншае, а зараз — бардак, п'янства. Усе ўсяго баяцца і не вераць у тое, што становішча можа палепшыцца. Пакінулі нас і дэканы, і выкладчыкі, ніхто не прыходзіць і не цікавіцца, як мы тут жывем. Сродкаў на рамонт ніхто не дае, а за так, ці за мізерную капейку, і студэнты не хочуць нічога рабіць».

Так, адсутнасць вады — вельмі клопатна для студэнтаў. На другім паверсе на кухні «лішнія» краны запаялі, пакінулі толькі тыя, дзе павінна быць гарачая вада. Але і яе няма! Што, можа пара студэнтам біць у колакал, ды так, каб разбудзіць тых, хто за ўсё гэта адказвае?

Жана Мазалеўская (5 курс, філфак): «Мы неўзабаве зарасцем граззю. Душавыя трэба пераводзіць на начны час работы. Вада там бывае ў 11—12 гадзін ночы. Трэба паўночы стаяць у чарзе, каб памыцца. Там жа працуюць толькі 2 ці 3 дожджыкі...»

Уявіце сабе, у якім становішчы сем'і, дзе ёсць маленькія дзеці. А іх у інтэрнаце нямала.

Дапамогі яны ўжо і не чакаюць. Нешта імкнуцца рабіць і самі, як Валадашчыкі. Але скардзяцца людзі сямейныя на студэнтаў, маўляў, не цэняць чужую працу. Рукі апускаюцца, калі ў цябе на вачах студэнты не могуць прыбраць за сабой, кідаюць смецце прама на падлогу, хаця ёсць для гэтага спецыяльныя бачкі.

Алена і Аляксандр Волахі падтрымліваюць Валадашчыкаў і гавораць, што просьбы не дапамагаюць, тут патрэбны строгія меры.

Бачыце, самі студэнты ўскладняюць сваё становішча. Ёсць людзі, якія старанна вучацца, але ім перашкаджае шум і гам на калідорах і лесвічных пляцоўках нават ноччу, калі ніяк не сціхае спеў «галасістых дзяўчат». Немагчыма выйсці ў калідор увечары, калі стаяць там слупы дыму. Многія студэнты, наогул, не могуць выносіць папяроснага дыму, але ім прыходзіцца ўсё гэта цярпець. Мяркуюць дзяўчаты, што раз ёсць такі смутны факт, што многія студэнткі кураць, то можа адвесці ім для гэтага які-небудзь закутак?

## Зноў ад першай асобы

Зараз аб тых, хто прыбірае ў інтэрнаце. Доўгі час на другім паверсе зусім не было прыбіральшчыцы. Студэнты па чарзе мылі калідор, а зараз там студэнткі працуюць у якасці прыбіральшчыц. На трэцім паверсе прыбіральшчыца ёсць, але яе бачаць вельмі рэдка. У самым жахлівым становішчы там туалеты. Каналізацыя сапсавана, і вада цячэ прама на падлогу...

Нерэгулярна мяняюць і пасцельную бялізну, хвалюе і дрэннае абслугоўванне ў буфеце. Студэнты незадаволены і асартыментам страў.

Не могуць змірыцца студэнты і з тым, што былая дысказала ператворана ў майстэрню, а што там у ёй майструюць, ніхто нават не ведае.

Дакучаюць тараканы і мышы...

## Погляд першакурсніка і пяцікурсніка

Ірына Ярмусік, Жана Шчэрба, Святлана Мікелевіч — студэнткі-другакурсніцы філфака. «Рады, што жывем у інтэрнаце. Кватэры ў горадзе вельмі дарагія, а тут ёсць і бібліятэка, і чытальная зала, ёсць пакой, дзе можна займацца спортам. Вось толькі гаспадара ў інтэрнаце няма, студсавет не працуе. Няма дзе правесці вольны час, калі хочаш цікава адпачыць. Хацелі зрабіць у буфеце студэнцкае кафэ, якое працавала б і ўвечары, але не дазволілі».

Валянціна Кропа і Іна Карпуць мяркуюць так: «Прасцей за ўсё беды зваліць на другога, скажам, на адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў. А што зрабілі самі? Прывыклі да бруду, толькі скардзяцца, а прыбіраць ніхто не хоча. Вунь, паперы на вуліцы бялеюць, як кветкі!»

Тэрэза Мікулка: «Давіць на сумленне цяпер мала. Трэба караць!»

## У прафкоме студэнтаў

Тут я сустрэлася з П. А. Кавалеўскім. Ён зазначыў, што на многія пытанні адказваюць самі студэнты.

— Кажуць, дай студэнту волю, развяжы яму рукі — і ён пераверне свет, — гаворыць Павел Аляксандравіч. — Але нашы студэнты паміж воляй і пасіўнасцю выбіраюць апошняе. Яны самі павінны зразумець, што многае залежыць ад іх. Вы самі нядаўна бачылі на дошцы аб'яў, што з інтэрната выключаны некалькі першакурснікаў. Я думаю, што за дрэнныя паводзіны павінны караць, калі не дапамагаюць папярэджанні.

Наконт вады, а, правільней, яе адсутнасці, хачу сказаць, што прафкому не выдзяляюць сродкаў, каб задаволіць усе запатрабаванні студэнтаў. Думаем, летам праблема ўсё ж будзе вырашана, калі пройдзе рамонт каналізацыі і дамбы, якая ўжо не можа забяспечыць нас вадой у патрэбнай колькасці.

Я прысутнічаў на сходзе, дзе павінны былі выбраць новы студсавет. Паказалі студэнты, на што яны здольныя. Да сур'ёзнай справы аднесліся са смехам. А прымушаць мы нікога не збіраемся. І яшчэ хачу звярнуцца да дэканаў, выкладчыкаў, да рэктара і прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Чаму яны так рэдка наведваюць інтэрнат, няўжо іх цікавяць толькі дзяржаўныя справы ды справы па сваёй непасрэднай рабоце ў кабінетах?

**АД РЭДАКЦЫІ: Так, шмат праблем і пытанняў у нашых студэнтаў. Яны апынуліся ў цяжкім становішчы. На многія свае пытанні самі ж адказваюць, але ёсць і такія, на якія змогуць адказаць толькі кампетэнтныя людзі. І не толькі адказаць на пытанні, але і аказаць пэўную дапамогу.**

**Г. КАМЕНЕВА.**

## ТУРЫСЦКІМІ СЦЕЖКАМІ

Веснавыя змены ў надвор'і кожнага чалавека прымушаюць уважліва паглядзець на навакольны свет прыроды. Цягне з горада ў лес, да ракі, да возера. І, мабыць, нідзе так не сутыкаешся з прыродай, як у паходзе.

# У дарогу!

У нас на фізічным факультэце склаліся багатыя турыстычныя традыцыі. Існуе шмат груп, якія займаюцца рознымі відамі турызму. Наша група склалася і існуе, дзякуючы дацэнту А. М. Баяркіну. У мінулым — шматлікія веласіпедныя і горныя паходы. У гэтым годзе ў нас павінен адбыцца велапаход у Ленінград і горны паход 3-й катэгорыі складанасці на Цэнтральны Каўказ.

А сёння я пастараюся расказаць аб днях нашага апошняга паходу ў горы.

Першы дзень маршруту... Наш шлях пачынаўся ў Баксанскай цясніне, на месцы ўпадзення р. Курмыгі ў р. Баксан. Шлях у даліну праходзіць па крутым склоне. Добра пратаптаная сцежка пятляла сярод дрэў. Падчас яна выводзіла нас на адкрытыя месцы, тады добра была бачна даліна р. Баксан і цяністы вадапад. Увогуле ўсё жыццё ў гарах запоўнена шумам горных рэк і ручаёў. Яны нясуць сваю крыштальна чыстую ваду ў цэнтральную артэрыю, на Цэнтральны Каўказ.

Пад'ём неўзабаве закончыўся «вісячай далінай». Нам адкрылася маляўнічая паляна, пакрытая малінай. Справа — круты спуск да ракі, злева — горны хрыбет. Дзень блізіўся да канца, і мы спыніліся ў невялікай пячоры, пад вялізным камнем-валуном. Хутка прыгатавалі палаткі для адпачынку, прыгатавалі снеданне, а затым быў доўгі незабыўны вечар у пячоры ля кастру, малінавы чай, песні пад гітару, непаўторныя жарты. У другога жыцця не бывае такіх вечароў, такога цудоўнага спалучэння душы з усім, што цябе акружае.

Як і абяцалі сіноптыкі, другі дзень сустрэў нас дажджом. Непрыемна было выпаўзаць з цёплага спальнага мяшка, але ўперадзе быў доўгі шлях да вяршынь. Даліну пакрываў густы туман. Мы спяшаліся, хацелі хутчэй падняцца ўверх, дзе замест дажджу ідзе снег. Але пад'ём быў доўгі, на шляху — рэчкі і ручаі, якія падняліся ад ападкаў, і перашкаджалі нам у дарозе.

Але за ўсе выпрабаванні туманам і дажджом прырода дорыць нам вечарам цудоўнае відовішча. Мы прыпыніліся на прывал, трэба было шукаць месца для начнога адпачынку. І ў гэты момант туман сышоў уніз, у даліну. Паветра стала крыштальна чыстым, зверху — рэдкія воблакі, а вакол нас — горныя хрыбты. Уперадзе — магутны ляднік, па яму і праходзіць шлях да перавала. Гэтае відовішча працягвалася некалькі мінут. Затым туман зноў прыйшоў на сваё месца. Гэтай ноччу на гарачыню ніхто не скардзіўся, таму што ў палатцы без шапкі мёрзлі вушы. Менавіта таму мы сустрэлі ранак з падвоенай радасцю.

Дзень абяцаў быць сонечным. Недалёка на склоне — статак дзікіх коз, не звяртаючых увагі на прысутнасць людзей. Паснедаўшы і сабраўшы палаткі, мы працягвалі сваё вандраванне.

Цяпер наш шлях праходзіць па белых скалах, якія называюць «барановымі ілбамі». Вычварныя горныя хрыбты са снежнымі вяршынямі, камяні, зрываючыся са склону і з шумам падаючыя ўніз, расколіны ў ляднiку, якія трэба было абмінаць, — усё гэта незабыўна, непаўторна.

Мы стаялі на перавале, бачны былі толькі шпікі суседніх вяршынь і ў небе — арлы. Ніхто не адчуваў стомленасці, было толькі пачуццё радасці ад гэтай першай перамогі.

Горы любяць моцных і добрых. Тут, як нідзе, можна праверыць свае сілы, загартаваць здароўе і адпачнуць душой.

Мяне добра зразумеюць тыя, хто хоць адзін раз пабываў у гарах. А тым, хто яшчэ гэтага не зведаў, застаецца сказаць: «Не трэба ленавацца, збірайце рукзакі, і ў дарогу!»

В. АСКІРКА,
студэнт 5 курса фізфака.





# Перавал

Сонца было ўжо амаль у зеніцэ. Унізе, у даліне, усё жывое ў гэты час шукала выратавальны цень. Тут жа, на высаце каля трох тысяч метраў, тэмпература ледзь перавышала нулявую метку.

Наша група выйшла на седлавіну адгор'я, прымыкаючага да скальнай грады, і размясцілася на прывал. Нам заставалася набраць 200—300 метраў вышыні да перавалу, які вёў у даліну ракі Адыл-Су. За плячыма былі шэсць гадзін пад'ёму па добра вытаптанай сцежцы, якая, як мы спадзяваліся, вяла да перавалу.

Я зірнуў на гадзіннік — «пара». І мы рушылі ланцужком уверх. З кожным крокам павялічвалася крутізна таго, што зараз умоўна ўжо можна было назваць сцежкай. Скалы ж у гэтым месцы грады былі разбуранымі і, перш чым абаперціся на іх рукой ці нагой, трэба было пераканацца ў іх трываласці. Мы паменшылі адлегласць паміж сабой, каб камень, які мог вырвацца з-пад рукі або нагі, не паспеў ператварыцца ў снарад для таго, хто ідзе ззаду. Цяжка было пераступаць, і мусілі мы ўсімі сіламі дапамагаць крочыць нашым дзвюм дзяўчатам, якіх узялі на страхоўку.

...Нарэшце закончыўся скальны ўзлёт, і мы выйшлі на снежнае плато. Пакуль група адпачывае, мы з Францам Кандратам і Віктарам Аскіркам думаем сходзіць у разведку да перавалу. Пакінуўшы рукзакі і ўзяўшы толькі ледарубы, ідзём праз плато да апошняга скальнага ўзлёту. Рухаемся асцярожна, след у след. На гэтым месцы можа быць расколіна. Праз паўгадзіны мы ля падножжа скал, яшчэ паўгадзіны — і мы на грэбні грады. Адзін позірк уніз — і нам становіцца ўсё зразумела. Мы не на перавале, а на нейкай вяршыні, і рухаліся мы па альпінісцкай сцежцы. Па той бок грады ідзе стромкі спуск на 100—150 метраў. Калі тут спускацца, то неабходна тры-чатыры разы вешаць вяроўкі. Можна не паспець да цемры. Шукаем у бінокль перавал. Можна па грэбні грады прайсці да перавалу. Аднак, калі па абодва бакі ад цябе — бездань глыбінёй да 300 метраў, то такі маршрут трэба разглядаць толькі тады, калі няма іншых. Ёсць другі варыянт. Праўда, ён звязаны са стратай вышыні, набор якой даецца тут нялёгка. Належыць усё ж спусціцца са снежнага плато ўлева, і там ужо шлях уверх больш бяспечны.

Вяртаемся да нашых таварышаў. Вядома, навіны, якія мы прынеслі, нікога не ўзрадавалі. З такім панурым настроем мы пачынаем абедаць. Усё сухама, вады ўжо няма, а разагрэць снег на прымусе няма часу. Нядоўгія зборы — і ў дарогу. Вырашаем спусціцца з плато па лядоваму скіду. Скід, дарэчы, 60° і цягнецца ўніз на метраў гэтак 40, выпалажваючыся затым у плато, з якога мы ўжо можам падыйсці да перавальнага ўзлёту.

Я ўкручваю ледабур, кідаю вяроўку і знаходжуся на верхняй страхоўцы. Першым уніз ідзе Віктар Аскірка і забяспечвае ніжнюю страхоўку. Вяроўка нацягваецца, як тая струна, і ты, адпіхваючыся нагамі ад ледзяной сценкі, пачынаеш слізгацець уніз, блізкая небяспека ап'яняе чалавека. Але на гэты раз доля рызыкі памяркоўная. Ды і яе дастаткова для таго, каб пасля спуску, адшпіляючы непаслухмянымі рукамі карабін ад вяроўкі, адчуваць сябе пераможцам у гэтай гульні чалавека і гары. Так, большасць тых, хто прыходзіць сюды — гэта іграki, толькі вось гуляем усе па-рознаму. Таму што ў кожнага тут свой музыкальны акампанемент. Вось пайшла ўніз Крысціна, адна з нашых дзяўчат (у гэтыя хвіліны ў душы яе, пэўна, гучаць чароўныя, таямнічыя гукі). Генадзь Жытко крыху пануры. Мабыць, яму чуецца нешта ў стылі рэквіему...

Усё. Пайшлі. Выцягваю ледабур, кідаю ўніз вяроўку і, надзеўшы «кошкі», спускаюся да групы.

Праз гадзіну падыходзім да перавальнага ўзлёту. Ён уяўляе сабой скальную сцяну вышынёй каля 300 метраў. Сцяну акружае, падобны крапасным вежам, добры дзесятак востраканечных зубцоў. Уся града ад падэшвы да самага верху пакрыта дробнымі і буйнымі абломкамі скал. Краявід напамінае казачныя замкі пэнзля Чурлёніса. Пачынаецца пад'ём. Мы з Францам бяром у звязкі нашых дзяўчат і крочым наперадзе.

Лезем уверх, не спыняючыся. Непатрэбныя зараз ледарубы ў рукзаках. Платней прытуляемся да скал. Правая рука ідзе ўверх, у той час як рука левая і ногі замацаваныя на зацэпках. Знойдзеш апору для рукі, тады падцягваеш нагу да новай зацэпкі. Затым рывок уверх і зноў усё спачатку. З кожным крокам усё цяжэй цела, а сонца паліць мацней і мацней. Якім жаданым здаецца зараз прывал, глаток вады!

Асабліва цяжкія апошнія дзесяць метраў. Але нарэшце і яны пераадолены, і мы наверсе. Тут, на паўночным баку, ляднік падыходзіць да самага перавалу. Адразу знаходзім лужу і неўзабаве наша палуднаванне прыносіць такое вялікае задавальненне.

Пасля адпачынку аглядаем уважліва спуск па ледніку. Ён, між тым, аказваецца з сюрпрызамі. У асноўным гэта расколіны, але ж ёсць і такая, што дасягае 3—4 метраў — бергшрунд! Яна перасякае ўвесь ляднік, так што абыйсці яе немагчыма. Значыць, зноў вешаць вяроўку. Рыхтуем перад перападам роўную пляцоўку, уганяем па ўсю ручку ў снег ледаруб, замацоўваем карабін, і ў ім вяроўку. На канцы вяроўкі робім пятлю, і вось ужо гэтая пятля ў карабіне на грудзях у Віктара. Ён зноў пойдзе ўніз першым, замацуе там вяроўку. Я ж забіваю яшчэ адзін ледаруб у снег, прыціскаю да яго сваю самастрахавачную пятлю, бяру ў рукі вяроўку, і Віктар пачынае спуск. Ужо праз некалькі мінут ён знікае за грэбнем. Віктар ідзе дастаткова ўпэўнена, амаль не нацягваючы вяроўку. «Дайшоў да верхняга краю бергшрунда», — чуецца знізу яго голас. — «Увага! Спускаюся па вяроўцы да ніжняга краю». Вяроўка нацягваецца пад цяжарам яго цела, я гляджу на страхавачны ледаруб і вачам не веру. Як у замедленай здымцы бачная з-пад снегу частка ледаруба разам з карабінам і вяроўкай аддзяляецца ад сваёй ніжняй часткі і ляціць уніз, цягнучы за сабой і мяне. Мая ж самастрахавачная вяроўка нацягваецца, — зараз на адным ледарубе нас двое! Але як добра яна трымаецца! І Віктар ужо ўнізе на роўным месцы. Добра замацаваўшы абодва канцы вяроўкі, па аднаму пачынаем спуск. На жаль, у нас няма такой амуніцыі, якая б дазволіла спускацца ўсім па вяроўцы, затым можна было б выцягнуць верхнюю страхоўку, разам з ёй ужо стоячы ўнізе. Таму апошняму трэба ісці без страхоўкі. Застаюся адзін і спускаю на вяроўцы рукзак. Выцягваю страхавачны ледаруб. Павярнуўшыся тварам да схілу, пачынаю спуск. Вось я ўжо ў верхняга краю бергшрунда. На ім я гляджу на ніжні край і міжволі вырываецца: «Вось гэта да!» Перапад вышыні паміж супрацьлеглымі бакамі метраў пяць, не менш. Дно бергшрунда на метры два ніжэйшае, чым ніжні бок. Але ж гэта і не дно. Гэта снежны мост, які не вытрымае чалавека, а сапраўднае дно дзесьці на глыбіні 30, а можа і 40 метраў. Вось якая справа. Застаецца адно — скакаць!

Ужо перад самай зямлёй раскручваю сальта, каб паменшыць скорасць палёту. Пры падзенні не магу ўтрымацца на нагах, і мяне круціць і цягне па снезе сіла інэрцыі... Але ўсё гэта ўжо на супрацьлеглым баку бергшрунда.

Спуск да самага канца ледніка вядзем у звязках. З апошнімі промнямі сонца выходзім на марэну, дзе і разбіваем лагер. Наперадзе яшчэ два перавалы.

А. БАЯРКІН,
дацэнт кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі.



Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-80-70
Газета выходзіць штотыднёва
Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.
Тыраж 2000 экз.
Зак. 3410. АИ 02116.
Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.